ЗАЦВЯРДЖАЮ
Міністр інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

А.М.Карлюкевіч
”28” ... 2018 г.

ПАЛАЖЭННЕ
аб рэспубліканскім творчым конкурсе ”Пад знакам Года малой радзімы!”

1. Дадзеным Палажэннем вызначаецца парадак правядзення рэспубліканскага творчага конкурсу ”Пад знакам Года малой радзімы!” (далей – конкурс).

2. Асноўнымі мэтамі конкурсу з’яўляюцца:

рэалізацыя задач дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі ў развіцці рэгіёнаў краіны;

фарміраванне павагі да “малой радзімы”, уклад у яе развіццё, паказ яркіх дасягненняў па зберажэнню і адраджэнню роднага краю;

садзейнічанне выхаванню ў моладзі патрыятызму і любові да Радзімы праз паняцце “малая радзіма”, фарміраванню актыўнай жыццёвай пазіцыі маладога пакалення краіны.

3. Конкурс праводзіцца ў 2018 годзе.

4. Арганізатар конкурсу – Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (далей – Міністэрства інфармацыі).

5. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў сродках масавай інфармацыі (далей – СМІ) і на афіцыйным сайце Міністэрства інфармацыі (www.mininform.gov.by).

6. На конкурс прадстаўляюцца матэрыялы, апублікаваныя ў друку альбо якія выйшлі ў эфір тэлевізійных ці радыёвяшчальных СМІ, размешчаныя на Інтэрнэт-сайтах на працягу 2018 года.

7. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

Катэгорыя І – рэспубліканскія друкаваныя СМІ:

”Землякі“;

”Традыцыі і гісторыя роднага краю“;

”У Год малой радзімы – вялікія справы“;

”Малая радзіма – у фотаздымках“.

Катэгорыя ІІ – рэгіянальныя друкаваныя СМІ:

”Землякі“;

”Традыцыі і гісторыя роднага краю“;
”У Год малой радзімы – вялікія справы“;
”Малая радзіма – у фотаздымках“.
Катэгорыя III – рэспубліканскія электронныя СМІ:
”Землякі“;
”Традыцыі і гісторыя роднага краю“;
”У Год малой радзімы – вялікія справы”.
Катэгорыя IV – рэгіянальныя электронныя СМІ:
”Землякі“;
”Традыцыі і гісторыя роднага краю“;
”У Год малой радзімы – вялікія справы”.

8. Да ўдзелу ў конкурсе падаюцца:

заяўка на ўдзел у рэспубліканскім творчым конкурсе ”Пад знакам Года малой радзімы!“ па форме згодна з дадаткам да гэтага Палажэння;

апублікаваныя матэрыялы (арыгіналы альбо ксеракопіі), матэрыялы, якія выйшлі ў эфір тэлевізійных ці радыёвяшчальных СМІ (на электронных носьбітах), фотаматэрыялы (на папяровых носьбітах).

9. Конкурсныя матэрыялы з паметкай ”На конкурс“ не пазней 15 студзеня 2019 года накіроўваюцца ў Міністэрства інфармацыі па адрасе: 220004, г.Мінск, пр.Пераможцаў, 11.

10. Пераможцаў конкурсу ў кожнай намінацыі вызначае журы конкурсу, персанальны склад якога зацвярджаецца загадам Міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне журы афармляецца пратаколам, які падпісваецца яго старшынёй і сакратаром.

11. Журы вызначае пераможцаў конкурсу ў кожнай намінацыі, якія ўзнагароджваюцца дыпломамі Міністэрства інфармацыі 1, 2 і 3 ступені. Па рашэнні журы найбольш актыўныя ўдзельнікі конкурсу могуць быць адзначаны спецыяльнымі дыпломамі, прызамі і іншымі ўзнагародамі.

12. Узнагароджанне пераможцаў конкурсу будзе арганізавана ў лютым 2019 года.

13. Інфармацыя аб выніках і пераможцах конкурсу, даце і месцы правядзення ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў размяшчаецца ў СМІ і на афіцыйным сайце Міністэрства інфармацыі (www.mininform.gov.by).